# Сіла, мудрасць і трохі жаночай хітрасці

## Расказваем пра вобраз жанчыны ў беларускай традыцыі

ГОД БЕЛОРУССКОЙ ЖЕНЩИНЫ

**Яна і шчырая маці, і мудрая жонка, і клапатлівая выхавальніца дзяцей, і спрытная гаспадыня. Уявіце сабе, як нялёгка жанчыне было жыць, лавіруючы паміж афіцыйнымі законамі і няпісанымі правіламі, якія вызначалі амаль кожны крок: ад нараджэння і выбару будучага мужа да стварэння ўласнай сям'і і далейшага жыцця. І пры гэтым яна заўсёды ахінала сваёй пяшчотай і шчырай дабрынёй. Што цікава, нават з цягам часу асноўныя рысы ідэальнай беларускай жанчыны засталіся нязменнымі.**

### «Глядзі дзевак на кірмашы – можа знойдзеш па душы»

Калісьці жыццё жанчыны круцілася, як той стары добры фільм, дзе галоўная сюжэтная лінія – шлюб. І не дзіва, бо тады гэта быў сапраўдны «білет у адзін канец» на ўсё жыццё.

– Так-так, з кім век векаваць… – усміхаецца мая суразмоўца Ірына Калачова, этнолаг, доктар гістарычных навук, прафесар факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. – Выбар шлюбнай пары ў нашай традыцыйнай культуры – гэта не проста «пайсці за хлопца», а сапраўды лёсавызначальны крок, такое праграмаванне будучыні.

**Без сям'і – ніяк, нібыта і жыццё няпоўнае. Абласны этап рэспубліканскага праекта «Уладар сяла». Валожын, 2025 год**





Слуцкія сяляне. Пачатак XX стагоддзя



Сямейная пара ў святочным адзенні. XIX стагоддзе

Прафесар падкрэслівае: у традыцыйным беларускім светапоглядзе сумневаў не было. Чалавек павінен стварыць сям'ю, жыць у ёй, нарадзіць і выгадаваць дзяцей, а потым перадаць гэту традыцыю наступнаму пакаленню. А дзеці? Яны былі не толькі працягам роду, але і пераемнікамі, носьбітамі традыцый, тым самым мостам паміж мінулым і будучыняй. Так што калі думаць пра кірмаш, то гэта хутчэй не месца для пакупак, а цэлы рынак лёсаў!

Цяпер зразумела, чаму нашы продкі так не любілі халасцякоў, што лічылі іх амаль грэшнікамі, на адным узроўні з тымі, хто перарываў цяжарнасць ці не мог мець дзяцей. Не ўступіў у шлюб да сарака гадоў – і ўсё, ты ўжо не зусім свой. Цябе як быццам выключалі з сямейнага кола і дазвалялі хадзіць хіба што на пахаванні ды памінкі. Такія вось «прывілеі» для тых, хто не знайшоў сваёй палавінкі!

А вось жанчынам трэба было ў поўнай меры рэалізавацца ва ўсіх сваіх іпастасях, як кажуць навукоўцы. Быць жонкай, маці, гаспадыняй, выхавацелькай – усё разам, каб лічыцца шчаслівай. І вядома ж, гэта магчыма было толькі ў сям'і, у атачэнні родных. Без сям'і – ніяк, нібыта і жыццё няпоўнае.

Але, як ні дзіўна, навукоўцы сцвярджаюць: у нашай традыцыйнай культуры паміж мужчынскім і жаночым светам усё ж была мяжа. А правілы, якія рэгулявалі адносіны, існавалі не пісаныя, а такія, што ўсе ведалі і прытрымліваліся.

– Насамрэч, наяўнасць мяжы была ўмоўная, бо канфлікту паміж мужчынскім і жаночым не існавала, – заўважае Ірына Калачова. – Заўсёды спрацоўваў прынцып узаемадапаўняльнасці. На гэтым досведзе фарміраваліся віды і формы традыцыйнай культуры: матэрыяльнай, духоўнай, сацыяльнай.

## *«Выбар шлюбнай пары ў нашай традыцыйнай культуры – гэта не проста „пайсці за хлопца“»*

Ніхто ні з кім не ваяваў, а проста кожны займаўся сваім. Мужчыны – адным, жанчыны – іншым, і такім чынам яны разам будавалі сваё жыццё і культуру. Нібыта добрая каманда, дзе кожны ведае сваю ролю і выконвае яе на ўсе сто! І ў гэтым, мабыць, і была мудрасць нашых продкаў.

Мужчына – абаронца, ваяр, галава сям'і і бацька дзяцей. Карацей, увесь набор «супергероя» ў адным флаконе. А жанчына? Яна – заступніца,

берагіня ачага, дарадчыца для мужа, гаспадыня, маці і выхавальніца.

У ідэальным свеце, дзе адносіны ў сям'і павінны быць як швейцарскі гадзіннік, жанчына – гэта ўвішная гаспадыня, якая гатуе так, што пальчыкі абліжаш, і вядзе хатнюю гаспадарку ні сучка ні задзірынкі. Яна ведае свае жаночыя абавязкі на выдатна. І ў іх ніколі не ўваходзілі такія, як паляваць, лавіць рыбу, нарыхтоўваць дровы ці распальваць печ.

Але не ўсё так проста, як здаецца на першы погляд. Жанчына ў сям'і – гэта яшчэ і «камунікацыйны цэнтр». Яна як берагіня, дарадчыца і ахоўніца ачага стварае ўтульнасць і цяпло. Нездарма ў народзе кажуць: муж – галава, а жонка – шыя.

– У традыцыйнай сям'і беларусаў жанчына звычайна была ў эпіцэнтры ўсіх падзей, як «шыя» яна здзяйсняла нябачнае кіраванне сямейным калектывам. Ад яе ў многім залежала, як жыве сям'я: наколькі яна дружная, гарманічная і здаровая, – пацвярджае прафесар Калачова.

Карацей, мужчына можа і «галава», але куды яна павернецца, вырашае «шыя». Дзеці, дарэчы, таксама ўважліва сачылі за бацькамі, іх адносінамі і тым, як слова супадае са справай.

Аднак, нягледзячы на ўсю «шыйную» мудрасць, сям'я, якую ўзначальвала жанчына, сустракалася вельмі рэдка. Паводле звычаяў, у XIX–XX стагоддзях галавой сялянскай сям'і быў мужчына. І ў яго руках – кантроль, улада і аўтарытэт. Што ж, кожнаму сваё: аднаму – «галава», другому – «шыя», а разам – моцная і дружная сям'я!



**[ НАША ДАСЬЕ ]**

**КАЛАЧОВА Ірына Іванаўна**

Этнолаг, педагог, доктар гістарычных навук, прафесар. Працуе на кафедры сацыяльных камунікацый факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З'яўляецца аўтарам больш як 100 навуковых і навукова-метадычных артыкулаў, пяці вучэбных дапаможнікаў і дзвюх манаграфій.

Спецыялізуецца на сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі і камунікацыях.

### *«Жанчына як „шыя" здзяйсняла нябачнае кіраванне сямейным калектывам»*

Прафесар падказвае: у старыя часы, калі чалавек хацеў быць шчаслівым, трэба было абавязкова стварыць сям'ю. Так-так, ніякіх вам «вольных птушак» і «самотных ваўкоў»! У народным кодэксе, які, праўда, ніхто не пісаў, але ўсе ведалі, былі спецыяльныя правілы для маладых: як стаць сямейным чалавекам і атрымаць салідны сацыяльны статус.

Мая суразмоўца Ірына Калачова расказала, што ўсё было вельмі рытуалізавана і залежала ад мясцовых традыцый. Вось, напрыклад, на Палессі: калі дзяўчынку купалі ўпершыню, ваду вылівалі за парог. Чаму? Каб замуж пайшла хутчэй! А калі хлопчыка – то ў кут з усходу, туды, дзе ў хаце размяшчаўся чырвоны кут. Бацькі такім чынам змалку закладвалі дзецям жыццёвы сцэнарый, каб мара пра шчасце збылася. А шчасце гэта, як мы ўжо зразумелі, толькі сямейнае.

Таму не дзіўна, што кожная дзяўчына ведала цэлы спіс парад, як выйсці замуж за каханага. На-

прыклад, было выдатным знакам, калі на даху хаты, дзе было кола, сяліўся бусел. У нас гэта птушка шаноўная, таму такі «госць» азначаў добрую волю і шчаслівую будучыню.

## «Не ляпніся ў лужу»

Але дзе ж раней можна было сустрэць свайго будучага мужа ці жонку? Пытаем у Ірыны Іванаўны.

– Па-першае, на вячорках, – адказвае яна. – Туды хлопцаў і дзяўчат гатавалі загадзя. І наведванне вячорак было абавязковым, асабліва калі дзяўчына на выданні. І тут зноў жа кіравалі свае правілы. Маці вучылі дачок, як размаўляць з хлопцамі. Напрыклад, нельга было адмаўляцца, калі запрасілі патанчыць, нават калі хлопец спачатку і не прыглянуўся. Іншыя парады таксама былі.

Як бачыце, усё не так проста, як здаецца на першы погляд! Увогуле, да бацькоўства і мацярынства рыхтаваліся загадзя. Гэта вам не сучасныя курсы для маладых бацькоў! Існавала цэлая сістэма народнага этыкету дашлюбных і шлюбных адносін. Там дэклараваліся такія якасці жаніха і нявесты, што сучасным хлопцам і дзяўчатам і не снілася.

Вось, напрыклад, хлопцу даваліся такія мудрыя парады: «Пазірай на матку, а жаніся на яе дзіцятку». Гэта значыць, глядзі, якая ў яе мама, бо яблык ад яблыні далёка не падае. А яшчэ «Не перабірай, а то скулу схопіш». Гэта каб не быў занадта пераборлівым, бо можна і зусім без пары застацца.

Дзяўчыне таксама старэйшыя людзі раілі. І не проста раілі, а наказвалі: «Ліхога любіць – сябе згубіць». Тут усё зразумела: не звязвайся з кепскім хлопцам, бо потым будзеш плакаць. І яшчэ: «Сілаю не быць мілаю». Каханне нельга вымусіць, яно альбо ёсць, альбо яго няма.

Вось такія былі правілы гульні ў сямейнае шчасце ў нашых продкаў. І, трэба сказаць, яны ведалі толк у гэтым! Бо сям'я – не проста ячэйка грамадства, а цэлы сусвет, дзе кожны выконвае сваю ролю, і ўсе разам ствараюць нешта неверагоднае.

Але мы трошкі забеглі наперад... Паводле слоў Ірыны Калачовай, раней маладыя людзі часта знаёміліся на кірмашах. Бацькі, якія мелі дарослых сыноў і дачок, абавязкова бралі іх з сабой, бо менавіта там можна было сустрэць сваю палавінку. Народ нават жартаваў: «Глядзі дзевак на кірмашы – можа знойдзеш для душы». І сапраўды, падчас гандлю, агульных спеваў, танцаў

**Прыгажосць XIX стагоддзя**











**На кірмашы ў Петрыкаве Мазырскага павета. XIX стагоддзе**

і гульняў на кірмашах лёс многіх маладых людзей вызначаўся. Гэта былі такія старадаўнія «сацсеткі», толькі з жывым гукам, пахам свежага хлеба і, вядома ж, з магчымасцю знайсці сваё шчасце сярод гандлёвай мітусні. І хто ведае, колькі шчаслівых сямействаў пачалося менавіта з таго, што хтосьці на кірмашы ўбачыў «дзеўку для душы» ці хлопца з добрым кашальком. Так што, калі наступным разам пачуеце пра кірмаш, успомніце, што гэта не толькі пра гандаль, але і пра гісторыю, культуру. І вядома ж, пра каханне!

Кірмашы былі вельмі папулярныя і распаўсюджаныя па ўсёй Беларусі. Як расказвае прафесар Калачова, 26 ліпеня ў Зэльве (Гродзенская губерня) штогод пачынаўся Ганненскі кірмаш – сапраўдны гандлёва-забаўляльны марафон, другі па маштабе ў Еўропе. Ён доўжыўся цэлы месяц у гонар святой Ганны. Пасля запрашалі на кірмаш у Свіслачы. А ў Нясвіжы гандаль і забавы мелі асаблівы размах. У XIX стагоддзі Гомель быў сапраўдным гандлёвым цэнтрам паміж Беларуссю, Украінай і Расіяй. Тут праводзілі ажно тры кірмашы на год: на Новы год, у Духаў Дзень і на Узвіжанне. Не адставалі і кірмашы ў Шклове, куды з'язджаліся купцы з Пецярбурга, Масквы і Ніжняга Ноўгарада.

Кожны кірмаш меў сваю спецыялізацыю. У Мсціславе можна было набыць пяньку і скуры, у Пінску – сырыя і гатовыя скуры, шчацінне, воск, мёд, сметанковае масла і алей (так, каб і на хлеб намазаць, і на патэльню паліць!). У Мазыры – жывёлу і коней, каб было на чым паехаць на наступны кірмаш ці проста ў гаспадарцы мець. У Слоніме – збожжа і лес, а ў Пружанах, што цікава, гарэлку прадавалі (каб адразу адзначыць удалыя пакупкі ці сустрэчы!). Зельвенскі кірмаш, той самы Ганненскі, славіўся продажам коней і сукнаў з розных фабрык – можна было і сябе прыбраць, і на падарунак нешта прыстойнае набыць. А ў Морачы на Любаншчыне гандлявалі грыбамі.

Нашы продкі свае адносіны будавалі нават на атракцыёнах! Вось, напрыклад, на Валожыншчыне на Спас ладзілі забаву «Не ляпніся ў лужу», каб юнак мог сваёй дзяўчыне, ці то каханай, ці то проста добрай сяброўцы, яблык выйграць. Назва ўжо сама за сябе гаворыць, праўда? Агароджаная пляцоўка, на «козлах» стаяць начоўкі з вадой, а на паверхні – прыгожыя, смачныя яблыкі плаваюць. Начоўкі такія, што лёгка пераварочваюцца. Гулец, заплаціўшы дробязь, адступае дзесяць крокаў, яму завязваюць вочы. Па камандзе – тры кругі вакол сябе, дзесяць крокаў наперад і рэзкі рух рукамі ўніз. Калі трапіў на яблык – віншуем, прыз твой! А калі не паспрыяла ўдача і рука кранула начоўкі – усё, вада на галаву! Але нічога, начоўкі



Дзе ў сям'і лад, там дзеці добра гадуюцца. Бабруйскі павет, 1911 год



Маці, матуля, матулечка... Любоў да яе ў беларусаў – цэлая філасофія

зноў напаўняюцца, і гульня працягваецца. Выйграць у гэтым атракцыёне лічылася справай гонару, а галоўнае – радасць для каханай.

Калі да вяселля рыхтаваліся, быў звычай «Лад». Запрашалі толькі замужніх жанчын, родных, каб пазнаёміць маладую з асновамі сямейнага жыцця. Вучылі, як жыць у ладзе. А што гэта значыць? Жыццё ў гармоніі, без канфліктаў, у згодзе. Як казалі ў народзе, жыць душа ў душу. У беларускай сямейнай абраднасці гэта тэма займае шмат месца. І прыказкі адпаведныя ёсць: «Дзе ў сям'і лад, там дзеці добра гадуюцца», «Нашто той клад, калі ў сям'і лад».

Яшчэ жанчыны сустракаліся на свята «Свяча». Адзначалася яно ў дні святой Ганны, Варвары і Кацярыны. Удзельніцы абменьваліся навінамі, абмяркоўвалі паводзіны маладых, іх учынкі. І нават выпрацоўвалі калектыўную думку пра важныя грамадскія справы ў вёсцы. А тыя, хто быў у канфлікце, менавіта на «Свячы» мірыліся і прасілі прабачэння адна ў адной. Вось такія былі часы – і гульні з гумарам, і мудрыя парады, і дараванне крыўдзіцелям.

Беларускія даследчыкі, паглыбіўшыся ў скарбніцу народнай творчасці – казкі, прымаўкі, загадкі і песні, – вывелі абагульнены вобраз жанчыны. У ім маладая дзяўчына заўсёды паўстае як будучая нявеста, а замужняя – як мудрая і добрая жонка, верная дарадчыца свайму мужу. Аднак цэнтральнае месца ў гэтым вобразе займае жанчына-маці, якая з любоўю выхоўвае сваіх дзяцей.

## «Родную маці нікім не заменіш»

Ёсць такія рэчы, якія ніякімі словамі не апішаш, але кожны адразу разумее. Вось, напрыклад, любоў да мамы. У беларусаў гэта не толькі пачуццё, а цэлая філасофія, як падкрэслівае этнолаг Ірына Калачова. Як жа перадаць усю глыбіню сувязі, дзе знайсці тыя самыя словы, каб апісаць усю любоў і прыхільнасць паміж маці і дзіцем?

Здаецца, што можа быць прасцей, чым звярнуцца да мамы? Але ж і тут ёсць свае нюансы! Мы называем яе роднай маці, мамай. Народная мудрасць падкінула нам яшчэ больш ласкавых і паважных зваротаў: матуля, мамуля, мамачка-галубка. І гэта не звычайныя словы, а цэлыя песні любові!

А памятаеце, як даўней да старэйшых звярталіся на «вы»? Так -так, і да мамы з татам таксама. Гэта быў знак асаблівай пашаны і павагі.

Навукоўцы кажуць, што першы ўрок любові да роднай мовы і традыцый дзіця атрымлівае ад

мамы – з калыханкі. І гэта праўда! Першыя словы і крокі, першыя ўсмешкі звязаны з мамай. Менавіта мамы надзвычай ласкава называюць сваіх дзяцей: сыночак міленькі, галубочак сізанькі, сынок-сакалок, дачушка-сакатушка, дзіцятка… Хто ж яшчэ так суцешыць, пашкадуе і паклапоціцца, як не мама?

### *«Паважліва-шаноўныя, ласкавыя адносіны да маці – наша беларуская рыса»*

А якая радасць, калі ўжо дарослыя дзеці, седзячы за святочным сталом, кажуць: «Дзякуй, мамачка, дзякуй, родная, за тваё гадаванне». Так звярталіся да матулі на мазырскім Палессі. Яшчэ казалі: «Добрае дзіця бацькоў мыслі адгадвае». Гэта ж праўда жыццёвая!

– Паважліва-шаноўныя, ласкавыя адносіны да маці – наша беларуская рыса, – адзначае прафесар Ірына Калачова. – Гэту ісціну дзеці засвойвалі з самых першых дзён. Таму і нарадзіліся такія мудрыя прымаўкі: «Родную маці нікім не заменіш», «Матчыны рукі заўсёды мяккія», «У каго маці родненька, у таго сарочка беленька»… Сапраўды, мама – той чалавек, які бліжэй за ўсіх. Ад яе залежыць мір і спакой у сям'і, добрыя адносіны і згода. Яна – першая настаўніца, выхавальніца і ўзор добразычлівасці.

Але, напрыклад, у адносінах да сыноў мама часта займала пазіцыю, скажам так, «другой скрыпкі». Тата ж з'яўляўся «дырыжорам» сямейнага аркестра, і яго слова для сына было як закон, высечаны ў камені. Нездарма ж кажуць: «Бацькава слова дарэмна не гаворыцца». У прымаўцы схавана цэлая філасофія!

Мама – зусім іншая гісторыя! Яе слова для сына – як цёплы плед у халодны вечар, як парасон у залеву. Гэта падтрымка, ахова ад усялякіх глупстваў, перасцярога ад няўдач і, не дай Бог, неапраўданай рызыкі.

Часам маці выступала ў ролі своеасаблівага дыпламата паміж строгім бацькам і дзецьмі, заступніцы іх інтарэсаў. Ну памятаеце, як у дзяцінстве: «Мама, скажы тату, што я не хацеў!» А яшчэ, як мы згадвалі ўжо, матуля – ахоўніца роднага дому, берагіня яго цяплыні і, вядома ж, клапатлівая гаспадыня. І вось гэты вобраз для сына станавіўся «прататыпам» яго будучай жонкі і сям'і ўвогуле. Калі мама ўмее і боршч зварыць, і парадак навесці, і яшчэ пры гэтым усміхацца – то чаму б і не?!

**Маладыя. Першая палова XX стагоддзя**



## «Шукай у агародзе»

Як казалі нашы мудрыя продкі, працаваць не любіш – чалавекам не будзеш. Сапраўдная ісціна, асабліва калі гаворка ідзе пра вобраз маці.

Наш эксперт Ірына Калачова падкрэслівае: працавітасць і працаздольнасць – тое, што робіць беларускую сям'ю моцнай. «Птушку пазнаюць па палёце, а чалавека – па рабоце», – жыццёвая мудрасць, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Для беларускай жанчыны працавітасць заўсёды была і застаецца адной з самых прывабных рыс. Нашы продкі гэта вельмі добра разумелі. Таму і раілі сваім сынам: «Не выбірай дзеўку ў карагодзе, а шукай у



Дзяўчаты лён бралі. Магілёўская губерня, 1903 год



Таўчы ячмень – справа адказная

агародзе». Зразумела, дзеўка, якая на градах шчыруе, – гэта вам не тая, што толькі на танцульках круціцца!

Сёння таксама шануюць працавітых жанчын. Нават сёлетні «жаночы» год быццам падкрэслівае гэту іх непераўзыдзеную якасць. Сучасніцы разумеюць: праца – інструмент, які дапамагае жыць і развівацца. Але, як адзначае Ірына Калачова, змянілася сама сутнасць працы. Нельга параўноўваць сялянскую жанчыну, якая цяжка працавала на зямлі, з сучаснай гараджанкай.

– Нашы студэнткі, напрыклад, часта працуюць з раніцы да ночы: ходзяць на курсы, займаюцца рэпетытарствам, і ўсё гэта, каб дасягнуць сваёй мэты, – гаворыць прафесар Калачова. – Змянілася якасць працы, але сама працавітасць застаецца важнай рысай жаночага вобразу. Нітачка пераемнасці не губляецца, а толькі відазмяняецца. Традыцыі жывуць, набываюць новыя формы і застаюцца важнымі для сучасных людзей. Гэта робіць нас моцнымі, мудрымі і шчаслівымі.

Памятаеце, як у дзяцінстве нам казалі: «Вучыся, каб потым добра жыць». У традыцыйнай беларускай сям'і гэта было не проста пажаданне, а цэлая праграма дзеянняў. Маці вучыла дачок усяму, што магло спатрэбіцца ў жыцці: шыць, вязаць, ткаць, вышываць. І ўсё з прыцэлам на будучыню!

Дзяўчына да свайго вяселля павінна была пакласці ў куфар рэчы, што яна зрабіла сваімі рукамі: адзенне для сябе і жаніха, пасцельная бялізна, галаўныя ўборы, абутак, падушкі, коўдры. Уяўляеце, колькі працы! Не звычайны пасаг, а, лічы, цэлы праект, які дэманстраваў усе навыкі дзяўчыны: ад працавітасці да ўпартасці і ўмення дасягаць сваёй мэты. А яшчэ ў куфары захоўваліся калаўрот, верацяно, міска і дзве лыжкі. Каб ужо дакладна нічога не забыць!

## *«Не выбірай дзеўку ў карагодзе, а шукай у агародзе»*

Што самае цікавае, гэты пасаг быў пажыццёвай уласнасцю жанчыны: калі раптам што, яна магла забраць усё, што прынесла ў сям'ю мужа.

Акрамя працавітасці, жанчына славілася яшчэ і ашчаднасцю. У традыцыйнай беларускай сям'і гэта была цэлая асобная гісторыя. Дзеці, пакуль не станавіліся дарослымі ці не ўступалі ў шлюб, сваіх уласных грошай практычна не мелі. Уся сямейная каса знаходзілася пад пільным вокам

маці. Яна была галоўнай «банкіркай» і распараджальніцай сямейнага бюджэту. А зараблялі зборам усяго, што давала прырода: ягады, грыбы, арэхі, лекавыя травы. Гэта быў не толькі спосаб пракарміцца, а цэлая эканоміка, дзе кожная жанчына была і збіральніцай, і прадаўцом, і галоўным бухгалтарам.

– Хадзіць па чарніцы – так бы мовіць, сталая традыцыя для Беларусі, – гаворыць Ірына Калачова. – Для беларусаў збіранне ягад было паказчыкам працавітасці. Такая справа вымагала сілы, спрыту і цярпення. Да яе прывучаліся як дзяўчаты, так і юнакі, бо гэта быў важны ўрок жыцця.



**Працавітасць, дабрыня, шчырасць і сёння асноўныя складнікі сямейнага дабрабыту**

Ірына Іванаўна ўспамінае, як у дзяцінстве ўся сям'я рыхтавалася да паходу ў лес.

– Мне, як самай малодшай, выдавалі невялічкі слоічак, мама звычайна брала пяцілітровае вядро, а яе нявестка, якая збірала лепей за ўсіх, наогул дзесяцілітровае, – усміхаецца Ірына Іванаўна. – Прычым мяне ніколі мама не прымушала збіраць ягады. Мае бацькі былі для мяне ўзорам, і я імкнулася быць падобнай да іх.

Сапраўдная педагогіка любові і прыкладу! Не прымус, а натхненне, не загад, а паказванне шляху.

Нашы продкі, калі бачылі прывабную дзяўчыну, казалі: «Прыгожая, як Ляля». А Ляля, нагадаем, гэта ж багіня Вясны! Але ж, як аказалася, прыгажосць – не галоўнае. Больш цаніліся працавітасць, дабрыня і шчырасць. Бо з тварам да вянца, а з розумам – да канца.

Беларуская жанчына з дзяцінства вучыла сваіх дзяцей не толькі працавітасці, але і самастойнасці, адказнасці і ўменню цаніць тое, што маеш. А яшчэ ветлівасці, годнасці, сціпласці, павазе да старэйшых… Быў цэлы комплекс навыкаў, які дазваляў ёй адчуваць сябе не проста часткай сям'і, а яе цэнтрам, рухавіком дабрабыту. І ўсё рабіла з усмешкай на твары, з любоўю да сваёй зямлі і з невычэрпным аптымізмам, што дапамагаў пераадольваць любыя цяжкасці.

Хто ж паспрачаецца з тым, што беларуская жанчына – сапраўдны скарб, які трэба шанаваць і берагчы?!

*Сняжана МІХАЙЛОЎСКАЯ*
*Фота БЕЛТА, з адкрытых крыніц*